## Нефармат

# Героі і баязліўцы



**Некалькі дзён таму ў стужцы навін звярнула на сябе ўвагу інфармацыя пра маскоўскага дызайнера Арцемія Лебедзева, якога аштрафаваў Мяшчанскі суд Масквы. У суд звярнуўся ветэран вайны, двойчы Герой Савецкага Саюза, які палічыў абразлівым запіс адказчыка ў сваім блогу «горад-баязлівец Брэст».**

Пост называецца «Горад-баязлівец». Яго аўтар, паводле асабістага пераканання, адкрывае Амерыку, калі паведамляе, што статус героя мае Брэсцкая крэпасць, а вось насельніцтва горада, у яго інтэрпрэтацыі, паспяшалася «ў поўным складзе» пакінуць занятую нямецкімі войскамі тэрыторыю. Аддаю належнае ведам і эрудыцыі дызайнера. Некалькі гадоў таму падчас адной сустрэчы аўтару гэтых радкоў даводзілася папраўляць маскоўскіх калег, якія памылкова называлі Брэст горадам-героем. А тут такая гістарычная дасведчанасць! Сапраўды, Брэст нямецкія войскі занялі фактычна за два дні, супраціўленне аказвалі пагранічныя заставы, невялікая ахова вакзала ды гарадскі ваенкамат... да апошняга патрона. А колькі там тых патронаў было ў параўнанні з рэгулярнымі армейскімі падраздзяленнямі? Крэпасць абаранялася доўга, пра гэта ведаюць усе.

А вось з насельніцтвам, якое пакінула горад у поўным складзе, у блогера выйшла прамашка. Шкада, што не напісаў куды выехалі: у Волагду, Ташкент, Самарканд ці, наогул, адплылі ў Турцыю. Каб так сталася, то і нядрэнна, колькі б тысяч людзей засталося жывымі! А так пакінуць горад паспелі партыйныя работнікі, спецыялісты, у асноўным з тых, хто прыехаў сюды ў 1939 годзе. Іх мясцовае насельніцтва называла «восточниками», бо прыехалі з усходу. Але ўдалося з'ехаць далёка не ўсім, ды пра гэта крышачку пазней.

Жыхары горада засталіся з сем'ямі, малымі дзецьмі. Ім трэба было неяк выжываць. Мне пашчасціла быць знаёмай з сям'ёй брэсцкіх інтэлігентаў Яраслава і Раісы Шырнюкоў. Яраслаў Захаравіч расказваў, як яны перажылі гады акупацыі. Вайну ён і жонка сустрэлі маладымі спецыялістамі. Яраслаў Захаравіч у 30-я гады скончыў "школу тэхнічную", па-нашаму — аўтадарожны тэхнікум, па спецыяльнасці будаўніцтва дарог і мастоў. Раіса Андрэеўна ў Варшаве атрымала дыплом урача-стаматолага. З першых дзён акупацыі яна абучыла мужа навыкам зубнога тэхніка, разам яны працавалі ў стаматалагічным кабінеце. Так зараблялі на кавалак хлеба, так змаглі перажыць цяжкі перыяд. Дык што, такіх, як яны — называць баязліўцамі?

Альбо варта лічыць такімі 20 тысяч вязняў брэсцкага гета, што былі вывезены на знакамітую Бронную гару і расстраляны там? Гэта, па сучасных мерках, цэлы райцэнтр людзей, якія, паводле меркавання спадара Лебедзева, пакінулі акупіраваную тэрыторыю. Не, яны не пакінулі, іх спачатку загналі ў гета, а потым, у лістападзе, калі стаялі першыя маразы, павезлі да Броннай гары. Там людзей распраналі дагала, каб забраць усялякія каштоўнасці, і ўжо голымі гналі амаль кіламетр да ямы. Потым адзін паліцай на судзе расказваў, як малы хлопчык, ледзянеючы ад холаду, крычаў: «Мама, хутчэй бы ўжо куля, а то няма сілы трываць!» Ну што ты будзеш рабіць: баязлівец.

Такой жа была і падпольшчыца Галіна Аржанава, калі прасіла яду ў сваіх таварышаў. Маладая дзяўчына, зямлячка Арцемія Лебедзева, яна прыехала ў Брэст пасля заканчэння Маскоўскай фармацэўтычнай школы. Працавала ў аптэцы. З пачаткам акупацыі стала падпольшчыцай. Ну якая падрыхтоўка, якія навыкі канспірацыі ў звычайнай дзяўчыны? Схапілі яе, катавалі так, што многім героям і смельчакам не снілася. Знявечылі да непазнавальнасці, а дабіцца нічога не змаглі. У турме прыбірала цыганка Люба, яна і расказвала потым, і запіскі перадавала ад Галі. Дык вось Галіна ў адной з запісак прасіла перадаць ёй стрыхніну, мукі сталі невыноснымі. Але не паслухалі таварышы-падпольшчыкі, не дайшло да іх, што кожны чалавек мае мяжу трываласці. Мучылася яшчэ некалькі дзён, пакуль яе, напаўжывую, не павесілі. Цела прыгажуні, нечай дачкі, вісела яшчэ чатыры дні... Падпольшчыкаў было многа ў Брэсце, у тым ліку жанчын.

Прывяла не звязаныя паміж сабой прыклады, якія за мінуту ўзніклі ў памяці, а калі паглядзець якія-небудзь даведнікі, іх можна працягваць бясконца доўга. Але не ў тым рэч. Вельмі здзіўляе, як зараз людзі з пакалення ўнукаў і праўнукаў тых, хто «сербануў» акупацыі, лёгка вешаюць ярлыкі баязліўца адразу тысячам незнаёмых людзей. Добра, седзячы на маскоўскай печы, праз 75 гадоў ацэньваць тых, хто жыў ва ўмовах вайны. Хто перажыў — ужо герой. Колькі ім і пасля акупацыі давялося выпакутаваць! На фронце прызваных у 1944-м з вызваленых тэрыторый падвяргалі асаблівай праверцы. Бывалі выпадкі, у ВНУ не прымалі, бо жыў ва ўмовах акупацыі. У лагер можна было трапіць па першым падазрэнні з абцяжваючымі абставінамі ў выглядзе чатырох гадоў фашысцкага рэжыму ў тваім горадзе альбо вёсцы. Татальныя праверкі, масавае падазрэнне ў супрацоўніцтве. І вось вам — адгалоскі палітыкі, якую праводзіла ў жыццё НКВД. Відаць, сам таго не жадаючы, спадар Лебедзеў выступіў як дастойны нашчадак супрацоўнікаў асобых аддзелаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.34 | 18.16 | 10.42 |
| Віцебск — | 7.26 | 18.04 | 10.38 |
| Магілёў — | 7.24 | 18.06 | 10.42 |
| Гомель — | 7.19 | 18.05 | 10.46 |
| Гродна — | 7.49 | 18.32 | 10.43 |
| Брэст — | 7.47 | 18.35 | 10.48 |

### Месяц

*Першая квадра 09.10—15.10.*
*Месяц у сузор'і Рыб.*

### Імяніны

***Пр.** Аляксея, Вячаслава, Леаніда, Міхаіла, Пятра, Рыгора.*
***К.** Рэнаты, Даніэля, Эдуарда.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Ну і ну!

### ПАДЛЕТАК ПРАГУЛЬВАЎ З СЯБРАМІ БАЦЬКОЎСКІЯ ГРОШЫ

**Чацвёра адзінаццацігадовых падлеткаў у сталіцы на працягу чатырох месяцаў кралі грошы ў мужчыны, што пражываў у інтэрнаце. Па інфармацыі Ленінскага РУУС г. Мінска, агульная сума ўрону склала 10 тысяч рублёў новымі (сто мільёнаў недэнамінаванымі).**

Пацярпелы пражываў у інтэрнаце з жонкай і непаўналетнім сынам, які без дазволу ўзяў ключ ад пакоя, дзе бацька захоўваў грошы ў валюце. Ён браў іх часткамі, пакуль сябры стаялі побач і назіралі, каб ніхто не ішоў. Непаўналетні траціў сродкі на забавы, набываў для сяброў дарагія падарункі: напрыклад, веласіпед за 600 рублёў, мабільны тэлефон iPhone, спартыўны інвентар, двум сябрам ён купіў клетку з трыма хамякамі, яшчэ аднаму проста даў 600 рублёў. Дарэчы, на гэтыя грошы маці сябра набыла тэлевізар. На працягу лета прыяцелі штодня каталіся на атракцыёнах у парках забаў, некалькі разоў на дзень хадзілі ў «Макдональдс». Пры разборы падлеткі растлумачылі, што прасілі ў мужчын, якія злоўжывалі спіртным, абмяняць ім валюту ў абменніках, абяцаючы ў якасці ўзнагароды набыць для іх алкаголь.

Паколькі дзеці не дасягнулі ўзросту, з якога надыходзіць крымінальная адказнасць, у адносінах да іх бацькоў складзены адміністрацыйныя пратаколы. Штраф можа скласці да дзесяці базавых велічынь. Будзе разгледжана пытанне аб пастаноўцы падлеткаў на ўлік у інспекцыі па справах непаўналетніх.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## Даты Падзеі Людзі

### 13 КАСТРЫЧНІКА

**1792** год — закладзены першы камень у падмурак рэзідэнцыі прэзідэнта ЗША, якая з 1902 года стала больш афіцыйна называцца «Белым домам». Белы дом — пастаянная рабочая рэзідэнцыя прэзідэнта ЗША — знаходзіцца ў самым цэнтры Вашынгтона, на Пенсільванія-авеню. Участак для будаўніцтва Белага дома выбраў першы прэзідэнт ЗША Джордж Вашынгтон згодна з актам кангрэса, які прадпісваў рэзідэнцыі амерыканскага ўрада знаходзіцца «на адлегласці не больш за 10 міль ад ракі Патамак».

**1880** год — нарадзіўся Саша Чорны, рускі паэт-сатырык. Ён пакінуў Расію пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Гэтае рашэнне працягнула яму жыццё і дало магчымасць радаваць чытачоў сваімі кнігамі яшчэ шмат гадоў. Спачатку Чорны жыў у Вільні, дзе ім былі напісаны вершы пра гістарычную Літву, цыкл «Руская Пампея», у якім паэт прызнаецца, што для яго «няма шляхоў назад», а таксама кніга дзіцячых вершаў «Дзіцячы востраў». Улетку 1930 года Саша Чорны з жонкай пасяліўся ў маленькай хатцы на поўдні Францыі, дзе і памёр 5 жніўня 1932 года на 52-м годзе жыцця — перанапружыў сэрца, дапамагаючы суседзям тушыць пажар. На яго магільнай пліце высечаны радок з верша Пушкіна: «Жыў на свеце рыцар бедны». Аляксандр Міхайлавіч сапраўды быў падобны на таго самага беднага рыцара. Бязлітасны ў сваёй сатыры, у жыцці ён быў вельмі душэўным і добрым чалавекам.



**1896** год — нарадзіўся Мікалай Шчакаціхін, мастацтвазнаўца, педагог. З 1922 года працаваў у БДУ, адначасова з 1925-га — у Інбелкульце, у 1929—1930 гг. у АН Беларусі. Адзін з заснавальнікаў беларускага мастацтвазнаўства.

**1946** год — 70 гадоў таму нарадзіўся Уладзімір Сямёнавіч Кузьмін, беларускі фізік, доктар фізіка-матэматычных навук. Аўтар навуковых прац па фізіцы металаў і звышцвёрдых матэрыялаў, нестацыянарнай кагерэнтнай спектраскапіі кандэнсаваных асяроддзяў. Распрацаваў тэарэтычныя асновы ўліку ўздзеяння неаднастайнасцяў магнітнага поля на транспартныя з'явы ў гіперправодзячых металах.

### Было сказана

**Пятрусь МАКАЛЬ, паэт:**
*«Не адкладвайце на потым добрых спраў,*
*Не адкладвайце на потым справядлівасці».*

## УСМІХНЕМСЯ

— Мама, а ў нашага таты ёсць бацькі?
— Вядома, ёсць, гэта ж бабуля Валя і дзядуля Віця.
— А навошта яны нам яго аддалі?

**Дасведчаны сапёр Вася памыліўся адзін раз і... прыйшлося ажаніцца.**

— Верачка, што табе падарыць?
— Ды што хочаш! Галоўнае, каб футра прыгожа адбівалася ў дыяментах!

**Я не лянівы, я энергазберагальны.**

Размаўляюць дзве дамы:
— Усе мужыкі п'юць!
— А мой гад яшчэ і есць!

**Тэхнічка, якая прапрацавала ў школе 20 гадоў, можа з адлегласці ў 100 метраў трапіць анучай у рухомую цэль.**




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4081.
Нумар падпісаны ў 19.30 12 кастрычніка 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12